аб непарыўнай еднасьці і супольнасьці лёсу народаў; агрэсыўны імпэрскі панславізм — псэўдааргумэнтамі наконт адмысловай славянскай роднасьці; а рост узроўню інфляцыі і цэнаў — разважаньнямі пра рост вытворчасьці ды павышэньне заробкаў і пэнсіяў.

*„Камуфляваць“* гучыць па-беларуску — чуеце! — амаль як „мухляваць“.

# Кандыдат

***Андрэй Лапцёнак***

*Кандыдат* — той, хто намечаны для выбраньня, прызначэньня або прыёму куды-небудзь. Іншае значэньне слова *„кандыдат“* — навуковая ступень. У другой палове XIX стагодзьдзя такую ступень атрымлівалі выпускнікі ўнівэрсытэтаў. *Кандыдатам права* быў Кастусь Каліноўскі.

У савецкія часы спалучэньне *„кандыдат навук“* азначала навуковую ступень, якая прысуджалася на падставе абароны дысэртацыі, так называлі і чалавека, які ўжо атрымаў гэтую ступень.

Слова *„кандыдат“* паходзіць ад лацінскага *„candidatus“* — „апрануты ў белае“, і ўжо адным тым блізкае беларусам.

Раней у газэтах пісалі пра *кандыдатаў у члены КПСС*. Цяпер — пра *кандыдатаў у дэпутаты*. Затое ў гарадах нямногія ведаюць, што *„кандыдат“* — гэта і сталовы гатунак бульбы, выведзены ў Беларусі, позьнесьпелы і ўраджайны.

# Канстытуцыя

***Антаніна Хатэнка***

Ох і любім жа мы выхваляцца сваёй рахманасьцю ды пакорлівасьцю. Ужо ж такія мы паслухмяныя, гэткія спакойныя, ажно сумнеў бярэ, ці бывае ўвогуле ў сьвеце гэтулькі трываньня і цярплівасьці ў адным месцы?

А скажу ж я вам — бывае. Пэўне, такая нашая *канстытуцыя*, будова, гэткае ўстанаўленьне, склад нашай псыхікі. І якую ты нам *Канстытуцыю* звонку ні падкінь, як ні ўсталюй нашую дзяржаўную будову, як ні зьмяньвай склад, усё роўна мы будзем цярпліва чакаць, калі і хто дазволіць жыць лепей.

Як станеш чытаць якія гістарычныя нарысы, дык толькі дзівішся — чаму продкі здабывалі і мелі, а мы толькі страчваем тыя набыткі, разбураем тую будову? Якога ж мы складу, якое будовы? Няўжо маем *канстытуцыю* разбуральнікаў? Як добра ўгледзецца, дык якраз тое і відно. Складна, ладна жылося ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Дбайны Леў Сапега склаў Статут і быццам умацаваў гэтай *Канстытуцыяй* наш нацыянальны хрыбет.

Вядома, там рай — дзе нас няма. І *Канстытуцыя* самая мудрая, пакуль ня стане тваёй *канстытуцыяй* і тваім устанаўленьнем, — нічагуткі ня будзе адбывацца, акром трывушчага чаканьня.

Адно беларускае дзіцятка дакладней акрэсьліла нашае *канстытуцыйнае* бытаваньне і пачуваньне, спытаўшыся:

— Мама, а *кастытуцыя*, — гэта калі шмат касьцей?